і тады разам сходзім і дабяром да нагі. Анечка, добра зрабіла, што аддала сабе шыць сукенку. Матэрыі тут ніякай няма нідзе. Каб была сама тут, то хіба газовую сукенку купіла–б. Тое–ж і Міхееўне. Няма матэрыі. Добра было–б, каб ты сама прыехала на які дзень сюды. Пахадзілі–б з табою, паглядзелі–б. Дзецям, Анечка, паліто трэба аддаць шыць у Слабадзкім. Тут ёсьць адна арцель і тая так загружана работаю, што ўжо й не бярэцца рабіць да ліпеня. Ды ня зусім і акуратна тут робяць. От каб прыехала ты сюды, мы тут паглядзелі[–б] футра для Лоры. А мо' што зьяўлялася ў Слабадзкім. Трэба ёй справіць харошае футра на зіму.

Чакаю і цябе, Анечка, і дзяцей. Цалую Вас моцна.

Ваш *Адам*.

## № 113. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*29.VI.1935 г.*

Дарагія Анечка, Лорачка і Лялячка!

Пасылаю, Анечка, твой працоўны сьпіс. Гэта падпісана. Трэба толькі, відаць, засьведчыць подпісы будзе. Мо' гэта зробяць у Гарсавеце.

---

Аблігацыі правяраў. У 1–ым і 2–м тыражах на нашы аблігацыі выйгрышы ня выпалі.

---

Надумаўся я папробаваць падаць заяву ці запрос у які–небудзь фінансава–эканамічны тэхнікум на месца выкладчыка рахункаводзтва. Трэба толькі даведацца, у якіх месцах ёсьць падобныя тэхнікумы.

---

Нейк вельмі сумна гэтыя дні мне бяз Вас. От–бы хацелася, каб хутчэй адпачынак і быць разам з Вамі.

---

Перад сваім начальствам хачу, пачакаўшы крыху, паставіць пытаньне наконт кватэры. Вельмі ўжо апрыкрыла быць бяз яе, ды да таго–ж магчыма, што зімаваць давядзецца яшчэ тут.

---

Буду меркаваць, каб 12 ліпеня прыехаць дадому.

---

Абутку ўсё яшчэ ніякага няма. Вельмі шкода, што дзецям лета праходзіць бяз туфель.

---

Цалую Вас моцна.

Ваш *Адзік*.